Дзве думкі

У нумары штотыднёвіка за 25 лістапада 1988 г. пад загалоўкам «Нам засталася спадчына» друкаваліся матэрыялы «круглага стала» «ЛіМа», прысвечанага вяртанню літаратурнай спадчыны. Удзельнікамі гаворкі згадваліся імёны пісьменнікаў і палітычных дзеячаў 20—30-х гадоў, творчыя здабыткі якіх да сённяшняга дня не ўведзены ў агульнанародны ўжытак. Не толькі гістарычныя абставіны, але і часам рысы характару фарміравалі лёс нашых адраджэнцаў. Сярод іх і Антона Луцкевіча, пра рэабілітацыю якога «ЛіМ» не так даўно паведамляў.

Безумоўна, Антон Луцкевіч асоба ў нашай гісторыі неардынарная. Невыпадковы погляды і дзейнасць яго выклікаюць сярод літаратуразнаўцаў не толькі вялікую зацікаўленасць, але і спрэчкі. Праблемы, якія закранаюцца ў змешчаных сёння пад рубрыкай «Дзве думкі» артыкулаў У. Калесніка і У. Казберука, выходзяць за рамкі прыватнай палемікі пра асобу А. Луцкевіча. Ад вырашэння многіх з гэтых праблем залежыць будучыня нашай культуры.

Уладзімір **КАЗБЯРУК**

На крутых паваротах гісторыі

ЯНЕ СТАЎЛЮ задачу ў гэтым артыкуле намаляваць творчы партрэт Антона Луцкевіча. Патрэбна вялікая работа, каб прасачыць крок за крокам яго жыццёвы шлях, паразважаць і пра тое, што мы называем словам «заблуджэнні», і пра яго бясконцую самаахвярнасць. Ды і пра тое, што на нейкіх этапах ён мог і зняверыцца ў магчымасці ажыццяўлення ідэалаў, перамогі праўды і справядлівасці. 30-я гады давалі для гэтага дастаткова падстаў.

Пачну я з самага апошняга выказвання пра А. Луцкевіча. Нават такі ўдумлівы даследчык, які на кожным кроку паказвае прыклады руплівых і дбайных адносін да нацыянальнай спадчыны — і самай далёкай і найбольш блізкай, — нават У. Калеснік не ўтрымаўся, каб неяк вельмі ж неабдумана абвінаваціць: «Нехта павінен тэарэтычна абаснаваць, колькі ў тагачасных публікацыях правамернай крытыкі сталінскіх парадкаў і колькі антысаветчыны. Я не заклікаю рэабілітаваць Антона Навіну (Антона Луцкевіча. — **У. К.**), яго пазіцыю. Навіне нельга дараваць здраду Тарашкевічу і Грамадзе. Ён жа на судовым працэсе адкалоўся ад іх і стаў з абвінавачанага сведкам, інфарматарам пракурора» («ЛіМ», 25.XI.1988 г.).

Паколькі гаворка тут зайшла пра суд над Грамадой, дык з гэтай падзеі і пачну. Ды не сваімі словамі, а той ацэнкай, якую дала ёй газета «Правда» ў канцы лютага і пачатку сакавіка 1928 года. Яна паведамляла пра віленскі працэс у карэспандэнцыі з Варшавы: «Большое впечатление производит речь Антона Луцкевича, в течение 25 лет связанного с белорусским движением.

«Понятно, — говорит Луцкевич, — есть и моя доля трудов в том белорусском движении, которое теперь разрушается». В последнее время по состоянию здоровья Луцкевич ушел от политической работы и посвятил себя исключительно научной и культурной деятельности. Его впутали в процесс потому, что имя его слишком связано с возрождением белорусского движения. «Я не был согласен по всем пунктам с Громадой, — говорит далее Луцкевич. — Редактором громадовских изданий я не был и работал в них лишь в качестве журналиста и публициста». Так сцвярджалася ў 51-м нумары газеты «Правда». А ў № 53 паведамлялася пра заяву палі-

цэйскага камісара Васілеўскага: «На вопрос Луцкевича Василевский заявляет, что Луцкевич был душой белорусского движения и руководил этим движением, согласно указаниям Коминтерна. Если бы Луцкевич воспротивился, Громада не возникла бы».

Некалькі раней, у 1927 годзе, «Большая Советская Энциклопедия» (т. V, с. 374) сцвярджала, што ў «беларускай публіцыстыцы найвыдатнейшым з'яўляецца А. Навіна».

Вось якім бачыўся А. Луцкевіч да-ягодаўскага, да-яжоўскага, да-берыеўскага перыяду. Мы маем магчымасць пераканацца, што і той суд можна было ацэньваць інакш, а не так, як уяўляе сабе У. Калеснік (і як ён ацэньваўся часткай заходнебеларускага друку). Варта нагадаць, што і Б. Тарашкевіч пры сваіх непрыязных адносінах да паводзін А. Луцкевіча не мог яго абвінаваціць у тым, што ён якія-небудзь сакрэты выдаў паліцыі. А ведаў, бясспрэчна, шмат. Падрабязна пра ўсё гэта піша польская даследчыца Аляксандра Бергман у сваёй манаграфіі «Беларускія справы ў II Рэчы Паспалітай» (Варшава, 1984).

А. Бергман не хавае таго, што А. Луцкевіч адмежаваўся ад Грамады. «Сваімі паводзінамі, — адзначае даследчыца, — А. Луцкевіч дасягнуў дзвюх мэт: выйшаў на свабоду і выратаваўся ад падрабязнага следства. Аднаго і другога, напэўна, моцна жадаў».

Чаму «моцна жадаў»? Тут нам давядзецца выкарыстаць некаторыя дадатковыя звесткі. Паліцэйскі камісар на тым жа працэсе сцвярджаў, што А. Луцкевіч падтрымліваў кантакты з Кампартыяй праз розных асоб і выкарыстоўваў сродкі, якія даваў Камінтэрн. («Правда», 1928, № 53). Мяркуючы па ўсяму, аднак, хоць і называў прозвішчы пасрэднікаў (Лагіновіч, Бурын, Бабровіч, Сняткоў), даказаць гэтага не мог.

Прыблізна ж у гэты час, 28 студзеня 1928 г., у Варшаве, у другім аддзеле Польскага генеральнага штаба (аддзеле разведкі) была закончана работа над вялікім сакрэтным дакументам «Кароткі нарыс беларускага пытання». Там, у прыватнасці, на стар. 219 — 220 паведамлялася, што ў 1923 г. польская разведка нібыта перахапіла ліст А. Чарвякова да А. Луцкевіча. І не абы-які ліст. Вось яго змест:

«Дарагі Антон. Прабач мне, калі ласка, за маё такое доўгае маўчанне. Я не меў магчымасці пераслаць Вам усё тое, пра што мы дамаўляліся. Усё тое, што Вы прасілі, пасылаю Вам Бандарчуком. Долары перашлём Соняй. У друку паведамляйце, што грошы атрымалі з Амерыкі.

За агітацыю ў перыёдыцы я Вам вельмі ўдзячны. У Маскве ёю вельмі задаволены.

Прышліце каго-небудзь на з'езд Саветаў. Літаратуру друкуем. Прасіце ўсё, што трэба — будзем Вам пасылаць...»

Думаецца, што калі б Васілеўскі меў у руках гэты матэрыял, ён бы яго выкарыстаў. А калі ведаў і выкарыстаў, але не публічна, а ў працэсе допытаў? Тады Антон Луцкевіч вымушаны быў бы вырашаць: або прызнаць сябе платным агентам чужой дзяржавы, або публічна адмежавацца ад дзейнасці Грамады. І ў гэтым выпадку яму нават не давялося б уступаць у канфлікт са сваім сумленнем, таму што членам Грамады ён і сапраўды не з'яўляўся.

А ці не мог ён раней даведацца пра існаванне гэтага ліста ў руках разведкі? Ці выпадкова ў сярэдзіне 20-х гадоў ён адышоў ад палітычнай дзейнасці і асноўныя сілы аддаваў літаратурнай крытыцы?

Пытанняў узнікае шмат. І розных магчымых адказаў на іх — таксама. Настала пара заняцца сур'ёзнымі мэтанакіраванымі пошукамі ў розных архівах, у тым ліку і ў архівах Камінтэрна. А пакуль што можна дапускаць розныя версіі. Апрача той, што ён здрадзіў беларускай справе і стаў інфарматарам пракурора.

У дзейнасці А. Луцкевіча не раз заўважаецца нешта такое, што можна было б назваць дваістасцю. У 1922 г. ён з усёй энергіяй уключыўся ў кампанію па выбарах у польскі сейм. Але сваю кандыдатуру, нягле-

Уладзімір **КАЛЕСНІК**

Памяць — настаўніца жыцця

ВЫСЛОЎЕ, пазбаўленае кантэксту, як вядома, губляе або змяняе сэнс. Так здарылася, я лічу, і з маім выказваннем пра рэабілітацыю Антона Луцкевіча (Навіны) ў «круглым стале» «ЛіМа» (25 лістапада 1988 г.). Таму хачу аднавіць кантэкст гаворкі, унесці належныя ўдакладненні ды паспрабаваць шырэй глянуць на пытанне, якое ўваходзіць у адну з балючых зон народнай памяці і сёння патрабуе публічнага абмеркавання ў друку.

А. Сідарэвіч, жадаючы вярнуць літаратуры несправядліва забытага асветніка, публіцыста і крытыка А. Навіну, падвёў яго біяграфію пад канон ідэалізацыі: Луцкевіч быў сацыяліст, схіляўся да меншавікоў, а нацыяналістам ён не быў, ёсць у заходнебеларускім друку выказванне, што ён крытыкаваў толькі Сталіна, але сімпатызаваў Леніну. Выходзіла, што Антон Луцкевіч (А. Навіна) больш прагрэсіўны за Браніслава Тарашкевіча і, напэўна, за кіраўніцтва КПЗБ, адным словам — анёл, прадвеснік перабудовы. Мне падалося, што А. Сідарэвіч недастаткова ўлічвае рэальныя ўмовы публічнага жыцця буржуазнай Польшчы, дзе палітычныя пазіцыі дзеячаў выступалі ўсё ж дастаткова адкрыта, погляды палітыкаў не былі для грамадскасці сакрэтам. Наогул не мае сэнсу рэабілітацыя каго б там ні было па льготным тарыфе і адным махам: юрыдычна, палітычна і маральна.

Што датычыць юрыдычнай рэабілітацыі А. Луцкевіча, дык ён мае на гэта поўнае права, як і ўсе ахвяры беззаконнасці. Сёння грамадскасць, і я ў тым ліку, толкам не ведаем, за што ён быў арыштаваны, у чым абвінавачваўся, як даказвалася яго віна. А. Луцкевіч як грамадзянін быў пазбаўлены права на адкрыты судовы працэс, на выбар адваката, пакліканне сведкаў, адным словам, на самаабарону. Вядомы палітычны, грамадскі і культурны дзеяч, асветнік, літаратуразнавец і педагог загінуў як бяспраўная ахвяра самаволі, беззаконнасці, паталагічнай класавай нянавісці, таму імя яго заслугоўвае на рэабілітацыю. Самы спрэчны пункт ацэнкі А. Сідарэвіча запазычаны ў ветэрана рэвалюцыйнага руху Заходняй Беларусі, вядомай польскай даследчыцы Аляксандры Бергман, аўтаркі палітычнага партрэта А. Луцкевіча. Яна гаворыць, што А. Луцкевіч, як і Б. Тарашкевіч і іншыя дзеячы левага крыла беларускага вызваленчага руху, не быў нацыяналістам. Аднак А. Сідарэвіч не прыгадаў істотнага ўдакладнення А. Бергман: «Быў нацыяналістам у тым сэнсе, што беларускую, ці нацыянальную справу ставіў над усімі іншымі, у тым ліку і над справай класавай».

Не бяруся зараз ні абвяргаць, ні прызнаваць слушнасці абодвух выказванняў, лічу адназначную ацэнку прынцыпова немажлівай у сувязі з існуючай у нас яшчэ заблытанасцю паняццяў. Слова «нацыяналізм» у сталінскія часы азначала абвінавачанне ва ўсіх смяротных грахах: здрадзе народу, дзяржаве, справе рэвалюцыі і г. д. Біркі нацыяналістаў навешваліся аўтаматычна тым, хто быў на паслугах у польскай адміністрацыі, потым у гітлераўскіх акупантаў, хоць часта паслугачамі станавіліся сацыяльна непаўнацэнныя элементы, людзі, якія не дараслі да нацыянальнай свядомасці.

Ідэолагі сталіншчыны ператварылі паняцце нацыяналізму ў пудзіла, ураўнялі з нацыянальнай дэмакратыяй і нацызмам. Яно стала «дзікай» гіпербалай, умоўнай славеснай фігурай, непрыдатнай для аб'ектыўнай навуковай ацэнкі ідэйна-палітычных поглядаў сацыяльных груп і асобных людзей. У той жа час дакладна ўстанавіць, ці ёсць у свядомасці і паводзінах дзеяча, які належыць да невялікай прыгнечанай нацыі і ўдзельнічае ў вызваленчым руху, менавіта нацыяналізм — вельмі няпроста і даволі небяспечна для ісціны. Барацьба прыгнечанага народа супраць прыгнёту ўспрымаецца здаровым сумленнем як акцыя справядлівай самаабароны, змагання за свабоду. У. І. Ленін гаварыў, што «ў кожным буржуазным нацыяналізме прыгнечанай нацыі ёсць агульнадэмакратычны змест супраць прыгнёту і гэта... мы безумоўна падтрымліваем» (т. 25, с. 275). Ва ўмовах нацыянальна-вызваленчых рухаў патрэбна асудзіць праявы агрэсіўнага нацыяналізму, такія, як нацкоўванне сваіх супляменнікаў супраць прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, дамаганне прывілеяў для сваёй нацыі. Нічога такога ў працах А. Навіны (Луцкевіча) я не сустракаў, хоць і ўдзячнасць рускаму народу, якой патрабуюць вульгарызатары ў якасці алібі ад усіх падазроных, — таксама.

Прыветныя жэсты А. Луцкевіча ў кірунку палякаў тлумачацца падабенствам іх становішча з беларусамі ва ўмовах царскай Расіі, а пазней — палітычнаю тактыкай, паддобрываннем да Пілсудскага, якое прынесла А. Луцкевічу ў 1919 годзе канфуз. Так, з 1918 і па 1920 ён меў антыкамуністычную арыентацыю; праўда, і кіраўніцтва камуністычных арганізацый у прыфрантавой Беларусі не ішло насустрач нацыянальным дамаганням мясцовага насельніцтва, утварыла Заходнюю вобласць, Заходнюю камуну, але не БССР.

Захады па адраджэнні беларускай дзяржаўнасці, што вялі ў ініцыятыўным парадку патрыятычныя сілы беларускага народа ажно да ўстанаўлення БССР на тэрыторыі, адпавядаючай этнічным межам рассялення беларусаў, роўна як і дзеянні па ўз'яднанні беларускага народа ў адзінай дзяржаве пасля Рыжскага міру (1921 — 1939), нельга кваліфікаваць як праявы нацыяналізму, паколькі ў іх лідзіравалі лева-дэмакратычныя групоўкі і дзеячы.

А. Сідарэвіч, мне здаецца, не ўлічыў агульнай высновы польскай даследчыцы пра непрыдатнасць А. Луцкевіча на ролю палітычнага лідэра з-за няўстойлівасці характару і кампраміснасці. Як вядома, у маладосці ён прывык іграць другую скрыпку пры старэйшым браце Іване. Але ў часе хваробы брата і пасля яго смерці, што наступіла ў санаторыі Закапанэ ў 1919 годзе, А. Луцкевіч, вылучаны лідэрам вызваленчага руху, паддаўся правым нацыяналістычным настроям, адмовіўся ад галоўнага прынцыпу праграмы адраджэння, уведзенай яшчэ К. Каліноўскім — гэта двухадзінства класавага і нацыянальнага. Ён замкнуўся на дактрыне незалежнай дзяржаўнасці і страціў падтрымку радыкалаў і народных нізоў, якім патрэбны былі зямля, хлеб, а тады і нацыянальная свабода.

Ідэя незалежнай дзяржаўнасці ўжо ў 1919 годзе станавілася анахранізмам і падрывала прэстыж БССР, дзе з пачатку 20-х гадоў ажывала народная культура, мова, пачалося свабоднае развіццё беларускай нацыі на шляхах будаўніцтва сацыялізму.

дзячы на ўвесь свой уплыў і аўтарытэт, выставіць адмовіўся. І ў значнай меры дзякуючы яго намаганням група беларускіх дзеячаў была выбрана. У больш позні час членам Грамады не стаў, але публікаваўся ў яе выданнях. Не з'яўляўся і членам КПЗБ, але ў 20-я гады публічна і адкрыта сцвярджаў, што народ Савецкай Беларусі дабіўся сваёй дзяржаўнасці і што толькі на Усходзе ажыццяўляюцца спрадвечныя мары беларускага народа, бо палітыка Савецкай улады адкрыла неабмежаваныя магчымасці для развіцця нацыянальнай культуры.

У. Каленік хацеў бы ведаць, дзе была крытыка Сталіна (апраўданая, бясспрэчна), а дзе — звычайная антысаветчына. А хіба ж хтосьці аддзяляў Сталіна ад Савецкай улады, а Савецкую ўладу ад Сталіна? Ці мог хто-небудзь у 30-я гады супрацьпастаўляць іх?

І тым не менш, як гэта ні дзіўна, А. Луцкевіч не ставіў знак роўнасці паміж імі. Нам сёння цяжка гэта ўявіць, але на рубяжы 20-х і 30-х гадоў ён адчуў, што ў дзейнасці Сталіна вызначылася парушэнне марксісцкіх і ленінскіх ідэй! А вось Б. Тарашкевіч не зразумеў гэтага і жорстка паплаціўся.

Ці выпадкова Фабіян Акінчыц яшчэ ў 1931 г. абвінавачваў А. Луцкевіча ў тым, што той толькі Сталіна крытыкаваў, але заўсёды заставаўся прыхільнікам ідэй Леніна?! Гэты вельмі цікавы факт паведамляе А. Бергман са спасылкай на адпаведныя крыніцы. І ці можам мы сёння рабіць «хімічны» аналіз артыкулаў А. Луцкевіча 30-х гадоў, каб аддзяліць крытыку Сталіна ад антысаветчыны? Калі б мы заняліся такога роду пошукамі, то знайшлі б яшчэ і прыклады ідэйнай разгубленасці і непаслядоўнасці.

Наогул калі мы будзем з біяграфіі таго ці іншага пісьменніка або грамадскага дзеяча — му. А. Луцкевіч парваў сувязі з Пілсудскім яшчэ ў 1920 годзе, асудзіў нацыянальны эгаізм яго палітыкі ў Заходняй Беларусі, назваў гэтую палітыку ў загалоўку сваёй крытычнай брашуры «Польская акупацыя на Беларусі» і падтрымаў як старшыня Беларускага нацыянальнага камітэта нарастанне ў беларускіх патрыятычных асяродках Польшчы, Латвіі, Літвы, Чэхаславакіі сімпатыі да БССР. У яго кнізе «Адбітае жыццё» (1922) сцвярджаецца, што на ўсходзе рабочыя і сяляне будуюць Беларусь, і хоць не на ўсіх землях беларускіх, але адраджаецца дзяржаўнасць.

БССР аказвала ў 20-я гады вялікую маральную і палітычную падтрымку заходнебеларускаму насельніцтву. Гэта была і матэрыяльная дапамога па лініі Чырвонага Крыжа вучням Віленскай беларускай гімназіі, што пражывалі ў інтэрнаце — прысылка падручнікаў, кніг і часопісаў Управе Таварыства беларускай школы і многае іншае. Ведаючы гэта, А. Луцкевіч хваліў поспехі БССР у развіцці нацыянальнай культуры, таму невыпадкова, калі ён апынуўся ў Віленскай следчай турме як падазроны ў супрацоўніцтве з БСРГ, газета «Правда» змясціла яго партрэт у ліку праследуемых беларускіх дзеячаў, а «Звязда» апублікавала прысвечаны А. Луцкевічу верш У. Жылкі, у якім паэт услаўляў плеяду важакоў і духоўных натхняцеляў беларускага адраджэння. Ды вось на судзе А. Луцкевіч публічна адрокся ад БСРГ і ад Б. Тарашкевіча. Сваім адступніцтвам кінуў цень на іншых лідэраў як людзей, якія, нібыта падпарадкаваўшыся камуністам, паставілі пад удар арганізацыю. Дапамог уладам умацаваць прокурорскую версію віны, створаную рэакцыяй для расправы з вызваленчым рухам. Як зразумець і ацаніць такія паводзіны? Сучаснікі назвалі іх здрадай. Слушна. Вось гэта і стрымлівае мяне ад безагаворачнага далучэння да пахоплівай маральнай рэабілітацыі А. Луцкевіча, якая носіцца ў паветры. Магу прапанаваць толькі сваю версію змякчальных абставін. Прыроднаю рысай А. Луцкевіча, мне здаецца, увесь час быў мастакоўскі індывідуалізм. Пад уплывам абставін самасць яго натуры то зацiскалася, то ажывала, у апошніх выпадках ён станавіўся мала прыдатным да працы ў палітычных арганізацыях. Трагічна выбухнуў канфлікт сацыяльнага з прыроджаным у часе следства і суда над БСРГ. Як зазначае Б. Тарашкевіч, А. Луцкевіч увогуле не прыняў партыйнага білета гэтай магутнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыі, супрацоўнічаў у працэсе па дагавору, часам ухіляўся ад нямілых даручэнняў, не адчуваў у сабе патрэбнага ўдзельніку палітычнай акцыі калектывізму, салідарнасці і дысцыпліны. Пры спакойным стане грамадскага жыцця ён бы, відаць, займаўся толькі творчай працай — публіцыстыкай, крытыкай — і меў бы поспех. Ці не з тугі па такім стане грамадства і такім занятку А. Луцкевіч пачаў дзівачыць на судзе, ажно спрэс эпатаваў ксяндза Адама Станкевіча сваёй паляка-беларускасцю. Здольны прыстасоўвацца да абставін палітык, раптам ударыў у хамут і ў аглоблі. Дзеля асабістай карысці, захавання добрага імя яму ж выгадна было гуртавацца з кіраўнікамі БСРГ і ўмацаваць сваю пазіцыю ў вызваленчым руху. А ён паступіў супраць сябе, можна сказаць, ірацыянальна. Чаму? Спакваля ўзяла верх мастакоўская патрэба свабоды. Мажліва, у адзіночнай камеры азваўся і зацiскаемы на волі інстынкт захавання віду, які перамог родавае пачуццё абавязку. Інакш, чаму ж папоўніў палітычнае самагубства дзеяч, які па прыродзе быў пераважна здольным чалавекам свабоднай прафесіі ды пакутліва зносіў абавязкі функцыянера. І тым не менш, не мог жыць без абавязкаў...

У адпаведнасці з традыцыямі 30-х гадоў — выхопліваць нейкія факты, закрэсліваючы ўсё іншае, то ў нас не застанецца ніводнага чалавека, якому нельга было б нічога нагадаць.

Вазьму толькі два факты. Міхал Федароўскі, якога мы ўсе так шануем, у 1917 г. быў адным з тых, хто падпісаў зварот да так званай Рэгенцыйнай Рады (яна выконвала функцыі часовага ўрада яшчэ задоўга да афіцыйнага абвяшчэння незалежнасці Польшчы) з катэгарычным патрабаваннем стварыць моцную армію, каб сілай далучыць да Польшчы Беларусь.

А як Браніслаў Тарашкевіч, якога У. Каленік супрацьпастаўляе Антону Луцкевічу? Аднак менавіта ж ён, Браніслаў Тарашкевіч, у канцы ліпеня 1919 г. узначальваў беларускую дэлегацыю, якая атрымала ад Пілсудскага ласкавы дазвол на стварэнне Беларускай вайсковай камісіі і арганізацыю антысавецкай арміі.

Гісторыя ёсць гісторыя, і не нам яе папраўляць ці паляпшаць. Але жалезная логіка гісторыі, геніяльнасць ленінскай думкі былі такія, што Б. Тарашкевіч непазбежна прыйшоў да прызнання ідэй Кастрычніцкай рэвалюцыі. Як і Язэп Лёсік. Як і Змітрок Бядуля. Як і Максім Горкі, аўтар серыі антыленінскіх, антыбальшавіцкіх артыкулаў, сабраных і апублікаваных у 1918 г. у Петраградзе асобнай кніжкай пад назвай «Несвоевременные мысли».

А што пісаў А. Луцкевіч у канцы 20-х гадоў? У 1929 годзе, гэта значыць, пасля працэсу над Грамадой, з'яўляецца ў друку яго кніга «Адбітае жыццё», дзе былі сабраны дакументы, выступленні і артыкулы, прысвечаныя пераважна беларускай літаратуры. І вось толькі адна цытата з публікацыі, датаванай 6-м студзеня 1929 года: «...Рэвалюцыя, зламаўшы магутным ударам усю хітрую будоўлю старое царскае і капіталістычнае Расеі, сама сабой мусіла назаўтра ад руйнавання перайсці да будавання. І гэтае рэвалюцыйнае будаўніцтва жыцця Беларусі на новых падвалінах выклікае ў Купалы новыя настроі — настроі вольнага чалавека, пэўнага ў сваёй сіле, будаўніка лепшае будучыны для свайго народу. (...)

Ясна, што ў тым новым ладзе, які настаў ва Усходняй Беларусі, жыццё мусіла навязаць і новыя думкі Купале. І вось новыя песні ліюцца з душы ягонай». Так сказана ў артыкуле «Напевы ліры Янкі Купалы». Так на працягу ўсяго перыяду 20-х гадоў пісаў чалавек, якога сёння фальсіфікатары нашай айчыннай гісторыі і культуры бэсцяць на ўсе лады, называюць прыслужнікам то нямецкіх акупантаў, то Пілсудскага. А тое, што яшчэ ў 1920 г. А. Луцкевіч выдаў у Вільні на польскай мове брашуру «Польская акупацыя ў Беларусі», не мае чамусьці для такіх «гісторыкаў» ніякага значэння.

У перыяд першай сусветнай вайны, на нейкім этапе, ён лаяльна адносіўся да нямецкіх акупацыйных улад. Але можна нагадаць, што іменна тады ўпершыню адкрылася шмат беларускіх школ. Праўда, дазвол такі даваўся не для таго, каб ашчаслівіць беларускі народ, а каб яго адгарадзіць ад рускага і польскага народаў, каб супрацьставіць ім. Але, у сваю чаргу, і А. Луцкевіч не надта разлічваў на міласць акупантаў. І таму ў канцы 1915 г. — а гэта ж быў пачатковы перыяд акупацыі — ён, разам з іншымі беларускімі дзеячамі, стварыў у Вільні падпольны камітэт, які накіроўваў дзейнасць легальных беларускіх арганізацый.

Вядома, сёння мы маем дастаткова падстаў, каб прад'яўляць А. Луцкевічу абвінавачанні за дзейнасць перыяду 1917—1920 гадоў. Але ці спрабаваў хто-небудзь разабрацца ў іх аб'ектыўна, з улікам канкрэтных гістарычных абставін?

Беларускаму нацыяналізму ўжо і тады супрацьстаяў інтэрнацыяналізм — досыць своеасаблівага кшталту. Нагадаю, як ён выглядаў у інтэрпрэтацыі аднаго з найбольш вядомых дзеячаў той пары Вільгельма Кнорына: «Мы считаем, что белорусы не являются нацией и что те этнографические особенности, которые их отделяют от остальных русских, должны быть изжиты. Нашей задачей является не создание новых наций, а уничтожение старых национальных рогаток. Белорусское же движение является таким воздвижением новых национальных рогаток, не существовавших до сих пор, а поэтому коммунисты не могут в каком бы то ни было виде принимать участие в этом движении». («Звезда», 12.IX.1918). Можна нагадаць, што пагром беларускай нацыянальнай культуры пачаўся артыкулам таго ж самага «інтэрнацыяналіста» Кнорына «Аб рашаючых «дробязях» у вялікім пытанні», апублікаваным у 4-м нумары часопіса «Асвета» 1928 год.

А калі ўжо з Савецкай Беларусі тымі ці іншымі шляхамі пачалі паступаць трывожныя весткі, дык ці мог А. Луцкевіч заставацца абыякавым да ўсіх падзей, звязаных з «вялікім пераломам» не толькі ў жыцці вёскі, але і ў культурным будаўніцтве, ва ўсім лёсе беларускага народа?

І вось наступіў верасень 1939 года. А. Луцкевіч выступіў у Вільні з прамовай, у якой шчыра, з энтузіязмам вітаў уз'яднанне беларускага народа ў адзінай Савецкай дзяржаве: «...Зноў Беларусь стала адзінай. Ніякія межы больш не будуць падзяляць адзіную родную беларускую зямлю. У На пабоішчы БСРГ паўстала так званая беларуская санацыя, альянс кансерватыўных палітычных груповак і культурна-асветніцкіх арганізацый—Цэнтрсаюз. Персанальнаю шыльдай гэтага аб'яднання стаў трыумвірат: А. Луцкевіч, Р. Астроўскі, Ф. Акінчыц. Палітычная пазіцыя згуртавання была ўхілістая: не толькі лаяльная ў адносінах да ўрада, а нават угодніцкая «апазіцыя» і заядлы антыкамунізм. Ва ўмовах нарастаючага крызісу, росту радоў КПЗБ і абвастрэння класавай барацьбы ў пачатку 30-х гадоў такая групоўка не магла знайсці сацыяльнай базы ні ў горадзе, ні ў вёсцы. БХД, якая ў вачах урада і дробнабуржуазных пластоў мела больш саліднасці: яснае антыкамуністычнае алібі і цвёрдую апору на моцных гаспадароўкатолікаў Віленшчыны, падстаўляла ножку Цэнтрсаюзу, і ён не закараніўся ў народную глебу, проста папоўніў калекцыю палітыканскіх тарадаек. Трыумвірат распаўся, што называецца, з музыкай: Фабіян Акінчыц выдаў за свой кошт аднадзёнку «Беларуская праўда», дзе абазваў А. Луцкевіча патайным камуністам, які хоць ушчувае Сталіна, але сімпатызуе Леніну. Па сутнасці гэтае абвінавачанне было рэхам пракурорскай версіі, выказанай на судзе над БСРГ. Пракурор сцвярджаў там, нібыта А. Луцкевіч практыкуе макіявелізм, калісьці, маўляў, ён служыў кайзераўскім агентам, а цяпер стаў савецкім. Нагавор Акінчыца не мог зашкодзіць Луцкевічу. Ён жа сам на следстве па справе БСРГ назваў сябе «паляка-беларусам, атэістам і прыхільнікам тэорыі Маркса». Усё гэта было ўспрынята, як дэманстрацыя светапогляднай нестандартнасці. За погляды суд не меў права караць, а прызнанне ў такой пікантнасці арыентацый прыцягвала да падсуднага ўвагу левай апазіцыі, абуджала прыхільнасць розных груп вальнадумнай інтэлігенцыі, што выступала за поўную свабоду думкі і сумлення.

Цэнтрсаюз захірэў, альянс распаўся. А. Луцкевіч аказаўся ў сітуацыі палітычнага банкрута, падаўся ў культурна-асветніцкую сферу, хоць бачыў, што ўлады буржуазнай Польшчы, расправіўшыся з БСРГ, завастрылі палітыку нацыянальнага ўціску, закрылі нават чыста культурныя беларускія арганізацыі. На жаль, уладам прынёс карысць і неапраўданы роспуск КПЗБ Камінтэрнам ва ўгоду хваравітай падазронасці Сталіна.

А. Луцкевіч, на жаль, не знайшоў сабе месца ў антыфашысцкім народнафрантавым руху другой паловы 30-х гадоў, не вярнуўся да класічнай формулы беларускага адраджэння, якую сам на заранку дзейнасці прапаведаваў і вобразна называў спалучэннем хлеба і свабоды, дэмакратыі з патрыятызмам, класавага з нацыянальным.

Калі прыняць крытэрый ацэнкі, якую прапануе А. Сідарэвіч, дык атрымліваецца неўразумеласць: А. Навіна не ішоў на кантакты з народным фронтам (дакладней сказаць, яго не запрашалі, бо ведалі пазіцыю і не хацелі мець справу з ім), але ён быў маркісістам-ленінцам, а Шырма, Стацкевіч, Танк, Васілёк, якія стваралі народнафрантавую думку, выходзіць, былі сталіністамі (?). Ці сэнсоўна весці маральную рэабілітацыю пад прыкрыццём юрыдычнай рэабілітацыі? Калі нам дорага добрае імя рэспублікі, мы павінны ўсё зрабіць, каб вярнуць не толькі грамадзянскія правы А. Луцкевічу, але і вярнуць да жыцця **лепшыя творы** яго на спажытак народу. Яны пісаліся для абуджэння сацыяльнай і нацыянальнай свядомасці народа. Няхай сам народ прачытае і ацэніць іх. Справа гонару кіраўніцтва рэспублікі даць мажлівасць пасмяротнага духоўнага самаапраўдання Антону Луцкевічу шляхам публікацыі яго апошняга пакутнага твора — споведзі, напісанай у 1939—40 гг. Дакумент гэты пасля XX з'езда работнікі абноўленых органаў КПБ паказвалі пісьменнікам. На шчасце, ніхто з аўтарытэтных мастакоў слова не ўзяўся каменціраваць гэты твор у пракурорскім плане.

Шлях А. Луцкевіча як палітыка і грамадскага дзеяча поўны супярэчнасцей, месцамі незразумелы, ён патрабуе грунтоўнага вывучэння і асэнсавання. Я гаварыў на сустрэчы за «круглым сталом», што не ў стане зразумець, як мог такі папулярны дзеяч адрачыся ад Грамады, пайсці супраць дэмакратаў і камуністаў. А потым як ні ў чым не бывала вітаць на Лукішскім пляцы ў верасні 1939 года Чырвоную Армію. Легкадумствам было дзеячу з такімі зігзагамі ў палітычнай біяграфіі заставацца ў Вільні. Луцкевіч нібыта сам напрошваўся на прыкрасці, што, вядома, не змяншае віны за прымяненне да яго рэпрэсій, беззаконнасці.

Тут насоўваецца версія адказу на пытанне, якое ставіць А. Бергман: чаму А. Луцкевіч не выехаў за мяжу ў верасні-кастрычніку 1939 г.? Супакоіла яго тое запрашэнне да супрацоўніцтва, а можа, і дыстанцыя, з якою паставіліся арганізатары часовай улады да былых членаў распушчанай КПЗБ, аддаючы сімпатыі тым інтэлігентам, што раней не займаліся палітыкай? Па гэтай прычыне ў Народны сход трапіў М. Машара і не трапіў больш палітычна акрэслены Максім Танк.

Думаю, не многа даб'ецца той навуковец, які захопіцца толькі спачуваннем і стане выпрамляць супярэчлівую біяграфію дзеяча, таксама як і той, хто, паддаўшыся злараднасці, пачне яе дэманізаваць, ачарняць. Першае ў маім разуменні асабліва не патрэбна А. Луцкевічу, бо яно будзе правакаваць другое і даваць спажыву чорнай міфатворчасці. Супакаенне сумленню прыносіць толькі ісціна, сумленная памяць, нават калі яна вымушана быць суровай і выдасца няўдзячнай. Сумленная памяць і ёсць настаўніца жыцця.